ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЧАЦВЕР
12 САКАВІКА
1992 ГОДА
№ 5(1671)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ШТО НОВАГА?

## РАЗ КАПЕЙКА, ДВА КАПЕЙКА...

Сацыёлагі, якія па службоваму абавязку першымі знаёмяць нас з чарговымі сюрпрызамі рынку, небеспадстаўна сцвярджаюць, што ў наступным годзе беспрацоўе пагражае найбольш верагодна асобам з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. Песімістычныя прагнозы пакуль не закранаюць «вышэйшага эшалону» адукацыі — суіскальнікаў, аспірантаў, дактарантаў.

Магчыма, некаторым з іх падасца нечаканым, што бясплатная адукацыя на самай справе патрабуе немалых выдаткаў. Скажам, пяць гадоў вучобы суіскальніка, улічваючы здачу кандыдацкіх экзаменаў, правядзенне заняткаў па філасофіі, замежнай мове, спецыяльнасці, а таксама тэхнічную работу, абыходзяцца універсітэту ўжо не ў 2864 рублі (калі кіраўнік — доктар навук), а ў 6975 рублёў, не ў 2016 (калі кіраўнік — кандыдат навук), а ў 6395.

Адпаведна ўзрос і кошт падрыхтоўкі ў аспірантуры і дактарантуры.

З безгаспадарчасцю ва універсітэце вырашана змагацца ўвядзеннем платнага навучання для «чужынцаў» — прадстаўнікоў іншых ВНУ і іншых краін СНД за кошт навучальных устаноў, якія іх накіравалі, ці за асабістыя грошы навучэнца.

А Ў ВАС? А Ў НАС!

## ЁСЦЬ АРГАНІЗАТАР!

Арганізаваны пасля жнівеньскага «пераввароту» Цэнтр маладзёжных ініцыятыў не проста займае частку плошчаў былога камітэта камсамола — каардынатар міжнародных праграм Іван РАК прытрымліваецца меркавання, што справу камсамола трэба некаму працягваць. Зразумела, што ў перыяд станаўлення асноўны дэфіцыт — людзі. Таму і прагучала ў размове з нашым карэспандэнтам РЭКЛАМНАЯ НОТА:

**«Сюды можа прыйсці кожны, хто хоча прапанаваць справу ці ідэю. Мы гатовы супрацоўнічаць. Ажыццяўляць ініцыятыву будзем разам».**

Цэнтр бярэ на сябе арганізацыйны бок справы, і яго работа пакрысе набірае тэмп. За «Красавіцкай гумарынай» плануюцца камерцыйныя і дзелавыя (будатрадаўскія) паездкі за мяжу, а ў верасні Цэнтр выступіць у ролі арганізатара на базе гістфака міжнароднага гістарычнага семінара пад назвай «Метад у гістарычным даследаванні». Але самыя неверагодныя намеры прыпадаюць на 1993—1994 гады — Цэнтр бярэцца за стварэнне міжнароднага маладзёжнага лагера, запрасіўшы моладзь з 7—8 краін.

Вось такія планы, якія, спадзяемся, не напаткае лёс планаў папярэднікаў Цэнтра.

ЛЮСТЭРКА

## РЫХТУЙЦЕ ВАШЫ СПІСЫ

Пэўна, і гістарычна вядомая Смаргонская акадэмія мела калісьці «букеты» уласных праблем. Але мінаюць часы, і праблемы мяняюцца, нязменнай пакуль што застаецца іх наяўнасць.

Якія яны ў сённяшняга студэнцтва?

Вынікі аматарскага анкетнага апытання сведчаць аб наступным. Адзінаццаць студэнтаў факультэта журналістыкі 3 курса адказалі, што на першым месцы па прынесеных клопатах ідуць:

1) фінансавыя праблемы, недахоп грошай — 6 чалавек;

2) праблема будучага працаўладкавання — 3;

3) жыллёвая — 5, уключаючы тых студэнтаў, каго непакоіць перавод студэнцкіх інтэрнатаў у ранг гасцёўняў — 3;

4) праблема навучальнай праграмы — 5, уключаючы колькасць тых студэнтаў, каго непакоіць якасць навучання і наогул прыдатнасць выкладаемых ведаў на практыцы — 2.

Другая група праблем, не такіх папулярных, уключае ў сябе:

1) праблему недахопу часу — 2;

2) пошук дадатковых сродкаў пражыцця — 1;

3) праблемы вольнага часу — 1, сексу — 1, алкагалізму — 2, песімізму — 1.

У асобную групу можна вынесці праблемы
— адсутнасці цікавасці да вучобы — 2;
— наведвання заняткаў — 2;
— выезду на прыроду ў час заняткаў — 1.

Толькі адзін студэнт быў у стане адказаць: «Праблем няма». Зайздросная пазіцыя.

Адказы на пытанне «Як вырашаеце свае праблемы?» сведчаць пра ступень энергаёмістасці асабістых намаганняў: «як магу», «як-небудзь, маю хобі», «ніяк», «вырашаю — працую па дагавору».

На пытанне, ці здольныя яны САМІ вырашыць свае праблемы, 5 студэнтаў адказалі станоўча, двое — адмоўна, скептычна аднесліся да сваіх магчымасцяў два чалавекі і цалкам дафеністычна — таксама двое.

Другім разам мяркуецца даследаваць настрой першакурснікаў.





## АДПУСЦІЛІ ДА НАС «ГІМАЛАІ»

Адной з самых значных культурных падзей у Мінску на мінулым тыдні стала адкрыццё ў Палацы мастацтваў выстаўкі карцін славутага Мікалая Рэрыха.

У экспазіцыі прадстаўлена 80 работ мастака з серыі «Гімалаі». Даўнія аматары яго творчасці могуць прыйсці на выстаўку, каб атрымаць асалоду. У астатніх ёсць добрая нагода для пачатковага знаёмства з ім: усе палотны экспануюцца на Беларусі ўпершыню.

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

ВЫ ЧУЛІ?

## НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ВЫБІРАЕ СТУПЕНЬ БАКАЛАЎРА

***Што ні кажыце, а ў цікавы час мы жывем, калі не ведаеш сёння, што з табой будзе заўтра. Літаральна: што будзеш есці, дзе жыць, як апранацца. Такая ж нявызначанасць пануе зараз і ў навучальных установах. Таму можаце лічыць нашу кароткую размову з начальнікам вучэбна-метадычнага ўпраўлення універсітэта, дацэнтам Віктарам Васільевічам САМАХВАЛАМ папераджальным дарожным знакам перад чарговым паваротам студэнцкага лёсу.***

— Вышэйшая адукацыя знаходзіцца зараз у стадыі рэфармацыі. Дзяржкамадукацыі СССР, якому мы раней падпарадкоўваліся, ліквідаваны. Цяпер мы падначалены Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з прынятым «Законам аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» вышэйшая адукацыя павінна перайсці на двухступеневую сістэму. Але такую рэформу у адзін дзень не правесці. Таму Міністэрства прыняла рашэнне, што да 1 верасня 1992 года ў ВНУ рэспублікі дзейнічаюць ранейшыя саюзныя пастановы і інструкцыі. А наступны навучальны год мы пачнём ужо па-новаму...

**— А ці не атрымаецца так, што сённяшні чацьвёртакурснік прыйдзе восенню і даведаецца, што яго навучанне закончана і яму застаецца толькі атрымаць дыплом?**

— У пастанове Вучонага савета універсітэта ад 27 студзеня, дзе змешчаны нашы прапановы па арганізацыі ступеневай падрыхтоўкі спецыялістаў, гаворыцца, што «студэнты, якія навучаюцца ў ВНУ на дадзены момант, завяршаюць навучанне па ранейшай сістэме». Калі гэта прапанова будзе ўлічана Міністэрствам, то сённяшнім студэнтам новая сістэма адукацыі не будзе замінаць.

Такім чынам, хоць дакладна пакуль мала што вядома, але шанс у нас з вамі ёсць. А ад слоў бакалаўр і магістр у мяне толькі дух захапляе, бо вучуся ж я пакуль на звычайнага журналіста.

А. ЮРЫН.

НАПРАВА ПОЙДЗЕШ...

## Культура ў горадзе

*З 1 да 28 лютага ў памяшканні Альтэрнатыўнага тэатра праходзіла выстава работ мастака Аляксандра Салаўёва, «надзвычай містычнага», як абяцала рэклама фірмы «VITA NOVA».*

Перад наведваннем выставы лепш за ўсё было б узняць свой адукацыйны ўзровень і змяніць кансерватыўныя погляды на мастацтва на нешта больш памяркоўнае. Тады вас не расчаравалі б вонкавая адсутнасць зместу ў аблямоўцы рам, абстрактныя плямы і шчодрасць у выкарыстанні алею.

Гледзячы на лаканічныя загалоўкі, можна было пераканацца, што мастак аддае перавагу духоўнай тэматыцы. Асобныя творы прыцягвалі інтэнсіўным святлом фарбы, нязвыкласцю колераў ў іх імклівым спалучэнні, раз-пораз выдавалася, што збег плям і гэтая сумбурнасць у напластаванні фарбаў таксама маюць што сказаць. Але абстракцыі вызначаюцца менавіта тым, што пра іх нельга штосьці казаць канчаткова. І калі б вы завіталі на вул. В. Харужай, 31а, вы змаглі б пабачыць самі.

## ФОНД АЛГАРЫТМАЎ ПРАДСТАЎЛЯЕ

*Рэспубліканскі фонд алгарытмаў і праграм праводзіў выставу-продаж праграмных сродкаў «Аўтаматызацыя медыцынскіх даследванняў і ўстаноў».*

*Правядзенне такіх выстаў, па словах загадчыцы фондам Таццяны Антонаўны АПАНАСЕВІЧ, абрана як найбольш актыўная форма супрацоўніцтва з кліентамі.*

РФАП можна аднесці да пасрэдніцкіх утварэнняў. Ён арганізаваны і працуе ў межах факультэта павышэння кваліфікацыі — гасразліковага факультэта ў структуры БДУ. Асноўны занятак фонда — заключэнне дагавораў з праграмістамі на распаўсюджанне распрацаваных імі праграмных сродкаў выкарыстальнікам ЭВМ. На сённяшні дзень у фондзе зарэгістравана 120 праграмных сродкаў.

**— Наколькі аўтарытэтны фонд?**

— Яго, між іншым, запрасілі ўдзельнічаць у выставе ў Аўстрыі. Аднак наш аўтарытэт выйшаў за межы нашых магчымасцяў. Фонд знаходзіцца на поўным самафінансаванні. Але ж для вырашэння асноўных праблем: пашырэння плошчаў і павелічэння колькасці персанальных ЭВМ, нам неабходна фінансавая падтрымка універсітэта. (гэта было б лагічна, бо нашымі паслугамі карыстаюцца многія кафедры БДУ).

**— З кім жа супрацоўнічае фонд у межах універсітэта?**

— У першую чаргу з факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Практычна ўсе кафдеры, якія маюць завершаныя распрацоўкі, ужо заключылі з намі дагаворы на распаўсюджванне праграмных сродкаў. Супрацоўнічаюць з намі і хімфак, і гістфак, і НДІ хімічных, ядзерных праблем, ПФП. Увогуле ж мы прымаем да вытворчасці не толькі «прадукцыю» універсітэта, але і ўсіх зацікаўленых аўтараў.

**— А што можаце прапанаваць гуманітарыям?**

— Праграму «Тэкставы рэдактар», якая складзена дзеля хутканаг рэдактавання і афармлення тэкстаў, або праграму аўтаматызаванага саставлення дзелавой інфармацыі на аглійскай мове.

**— Як ацэньваеце вы вынікі апошняй, чацьвёртай па ліку, выставы?**

— Я лічу, што да яе была праяўлена вялікая цікаўнасць. На прадстаўленні праграм прысутнічала не менш за 100 чалавек: галоўныя ўрачы, прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, работнікі гарвыканкома.

А вось наступная выстава, якая адбудзецца 21—23 красавіка, павінна зацікавіць многіх, бо датычыць аўтаматызацыі вышэйшай школы.

Заявы на прадстаўленне праграмных прадуктаў фонд будзе прымаць да 25 сакавіка. Наш тэлефон: 26-58-95.

ПЫТАННЕ РУБАМ

## КУДЫ ІДЗЕ СТУДЭНТ?

Надыходзіць вясна, па кішэнях гайсае вецер, але студэнтам не адмовіш у жыццяздольнасці. Задавальняючы попыт, усё больш аб'яў ва універсітэцкім холе зазываюць прапановай «лёгкага» баўлення часу: дыскатэкі, «інтэлектуальныя» вечарыны, кафэ, відэа, нават дзейнічае «Клуб вясёлых і знаходлівых».

Газета «Такая жизнь-2» стала адным са спонсараў Фестывалю ў абарону музычных меншасцяў Беларусі, што прайшоў у Доме настаўніка з 29 лютага да 1 сакавіка. У спісе выканаўцаў значылася ух-група «Б.Б», укамплектаваная студэнтамі журфака.

Так што студэнтаў можна лёгка падзяліць на дзве катэгорыі: а) аматары паглядзець; б) прыхільнікі дзейнічаць.

АБМЯРКУЕМ?

# ЧАС ПЕРАМЕН

**У канцы мінулага года на факультэце журналістыкі адбыліся выбары дэкана, і на гэтую пасаду на другі тэрмін абраны прафесар Алег Георгіевіч СЛУКА. Прапануем чытачам яго роздум аб праблемах універсітэцкага жыцця.**

Калі я прыйшоў на чынную пасаду дэкана, то адразу імкнуўся, як кажуць, авалодаць сітуацыяй на факультэце, пранікнуць ва ўсе тонкасці жыццядзейнасці вялікага калектыву, прыглядаўся да вопыту сваіх папярэднікаў і калег-дэканаў іншых факультэтаў. Імпанавала разважлівасць Р. А. Жмойдзяка, мудрасць А. С. Шуканава, смеласць А. М. Елсукова — маіх старэйшых таварышаў, а таксама сяброў-паплечнікаў В. М. Гадунова, А. П. Клішчанкі, Л. П. Прымачука і інш. Скажу шчыра, тое, што назапашана на ўсіх факультэтах універсітэта, і асабліва на філалагічным, прыкладной матэматыкі, радыёфізікі і электронікі, мае вялікую каштоўнасць, і выклікае здзіўленне той факт, што ў нас не праходзяць стажыроўку або вучобу калегі з іншых навучальных устаноў. Лічу, што гэта даволі значны пралік вышэйшай школы рэспублікі.

***НАША ДАВЕДКА:** На факультэце журналістыкі распрацаваны і ўведзены новы вучэбны план. Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па спецыялізацыях: друк, радыё, тэлебачанне, міжнародная журналістыка, фотажурналістыка. Вучэбны працэс ажыццяўляюць пяць кафедр, на якіх працуе 8 дактароў навук.*

Вывучаючы вопыт сваіх паплечнікаў, я зразумеў, што поспех працы факультэта залежыць ад мноства фактараў, сярод якіх галоўнымі можна лічыць: таленавітасць або пасрэднасць выкладчыцкага калектыву і мэтанакіраванасць рэктарата на раўнапраўнае стымуляванне іх працы на ўсіх факультэтах.

Нельга схаваць наш гістарычны грэх, бо амаль усе пасляваенныя гады і да нядаўняга часу прыродазнаўчыя факультэты развіваліся гегеманісцкі, за кошт гуманітарных. Капіраваліся горшыя прыклады. Вынік цікавы: ва універсітэце па два фізічных і матэматычных факультэта, два фізічных навукова-даследчых інстытута (з трох існуючых), ёсць такія навуковыя лабараторыі — аж за сто чалавек! Якую яны займаюць плошчу, цяжка ўявіць. І ўсё гэта за кошт іншых факультэтаў. Цяжка цяпер выраўніваць гэту праблему: людзей не скароціш, не звольніш.

Але адносіны да гуманітарных факультэтаў прынцыпова змяніліся, нягледзячы на распаўсюджаны размоўны нібыта «хімічны ўціск» у кіраўніцтве універсітэта.

Прыклад? Самы яскравы: на факультэце журналістыкі толькі за мінулы год куплена самае сучаснае камп'ютэрнае абсталяванне (рэдакцыйна-выдавецкі комплекс, дысплейны клас) больш чым на паўмільёна рублёў. Гэта адразу паставіла журналістаў на самы сучасны ўзровень тэхнічнай узброенасці, які цяпер існуе ў сродках масавай інфармацыі.

***НАША ДАВЕДКА.** На журфаку дзейнічаюць: каляровы тэлекомплекс, радыё- і фоталабараторыя, друкарня для выпуску вучэбнай газеты «Журналіст», дысплейны клас і клас машынапісу, рэдакцыйна-выдавецкі комплекс, лінгафонны кабінет.*

Я ведаю, што такія ж пазітыўныя працэсы ідуць і на іншых гуманітарных факультэтах. Зразумела, што гэта пазіцыя рэктарата і шаноўнага рэктара Фёдара Мікалаевіча Капуцкага. У сваёй складанай дзейнасці ён пайшоў на рашучыя змяненні ў структуры універсітэта. Усе помняць, якое было супрацьстаянне з нагоды перадачы на факультэты завочнага аддзялення. Выкарыстоўваліся такія аргументы, што завочнае навучанне загіне. Не прайшло аднак і года, як усе ўбачылі правамернасць такога рашэння. На факультэтах студэнты-завочнікі сталі сваімі ў поўным сэнсе слова, арганізаванасць вучэбнага працэсу ўзрасла, як і паспяховасць. Але ж колькі сродкаў сэканомлена!

Аднак я лічу, што гэты працэс ідзе марудна. У нас столькі нехлямяжых і непатрэбных структур, што аднаму рэктару з гэтым не справіцца.

Напрыклад, ужо амаль два гады ідзе гаворка аб рэфармаванні шматлюдных структур, якія абслугоўваюць замежных навучэнцаў. Гэта прарэктар па міжнародных сувязях і яго апарат, дэканат па навучанню замежных студэнтаў і яго апарат, цэлы падрыхтоўчы факультэт са штатам выкладчыкаў.

У застойныя гады за дзяржаўны кошт гэта структура стварыла ва універсітэце міжнародны філіял па дарэмнаму атрыманню вышэйшай адукацыі. Яшчэ год-два назад у БДУ было больш за тысячу замежных навучэнцаў.

Напрыклад, на тым жа факультэце журналістыкі за кароткі тэрмін была створана бясплатная (г. зн. за кошт нашай дзяржавы) вялікая замежная калонія студэнтаў.

***НАША ДАВЕДКА.** Факультэт журналістыкі выпусціў каля 400 замежных журналістаў для ста краін свету. Цяпер тут вучыцца 170 студэнтаў і 27 аспірантаў з 42 краін свету.*

Зразумела, што гэта гуманітарная, як цяпер кажуць, інтэрнацыянальная дапамога. Але ж патрэбны нейкія разумныя памеры. Тым больш, што беларускіх студэнтаў за мяжой адзінкі.

Такая міжнародная імправізацыя патрэбна была для стварэння асаблівага іміджу, бясконцых паездак за мяжу асобнай часткі нашых супрацоўнікаў.

Цікавая рэч! За пяць гадоў, якія прайшлі, згодна з інфармацыяй прарэктара А. В. Шарапы на вучоным савеце, амаль 1,5 тысячы супрацоўнікаў выязджалі за мяжу. І ніводнага з факультэта журналістыкі, дзе вучыцца самы вялікі кантынгент замежных студэнтаў ва універсітэце. Дык адкуль жа возьмецца параўнальны вопыт?

Яшчэ адзін прыклад. Нядаўна створана камісія па распрацоўцы новага Статута універсітэта. І адразу высветлілася, што ніхто не ведае статутаў замежных універсітэтаў, бо нават з трынаццаці дэканаў толькі адзін (!) за пяць апошніх гадоў быў у камандзіроўцы за мяжой.

Хіба такое становішча можна назваць разумнай палітыкай? Асобныя супрацоўнікі з года ў год выязджаюць за мяжу за універсітэцкія сродкі, а затым часцей за ўсё высвятляецца, што яны адбывалі там свой тэрмін дзеля асабістых памкненняў. Прарэктар па міжнародных сувязях і яго службы студэнтаў не маюць і фактычна гуляюць у бюракратычныя гульні, бо замежныя грамадзяне прыязджаюць, вучацца, выхоўваюцца і атрымоўваюць дыпломы на факультэтах.

Але ж міжнародная служба універсітэта трымае ў сваіх руках сувязі з замежнымі краінамі і надзяляе імі супрацоўнікаў па свайму меркаванню. Самачынна можна залічыць, адлічыць, зняць ці назначыць стыпендыю студэнту або аспіранту, кіруючыся нейкімі вышэйшымі меркаваннямі вялікай палітыкі без уліку думкі факультэтаў і кафедр. Канкрэтных прыкладаў можна назваць шмат.

Гэта прывяло да таго, што дэканаты і рэктарат не могуць адказаць на шматлікія пытанні замежнікаў: як іх пракарміць, апрануць, чым аплаціць пражыванне і нават забяспечыць праезд на радзіму. Выдаткі універсітэта не паддаюцца асэнсаванню! Затое нашы здабыткі мізэрныя.

На шыі супрацоўнікаў універсітэта павіс і падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян. Там самы цікавы расклад суадносін: выкладчыкаў — 50 і студэнтаў — 72. Каму гэта патрэбна?

Але больш цікава іншае. Там рыхтуюць студэнтаў для каго заўгодна, для БДПА, напрыклад, толькі не для нас. Факультэт журналістыкі заўсёды атрымоўваў студэнтаў з інстытута замежных моў. Гэта часта медыкі, інжынеры, фізікі, а мы з іх робім журналістаў. Прафесійнай арыентацыі аніякай.

Але такое «міжнароднае становішча» ва універсітэце ўжо ўсім абрыдла. Марная трата сродкаў і бюракратычная валтузня нам не па кішэні ў сучасным эканамічным становішчы. Гэтыя непатрэбныя структуры без страт павінны быць ліквідаваны, бо іх функцыі ўсё роўна здзяйсняюцца на факультэтах. І зноў-такі будуць сэканомлены вялікія сродкі, якіх цяпер вельмі не хапае.

Увогуле гаварыць і меркаваць за рэктарат у нас не прынята. Але ж з боку таксама шмат відаць, асабліва калі ты ў гэтым асяроддзі чвэрць стагоддзя.

Універсітэцкія структуры арганізаваны для каардынацыі, а больш для распрацоўкі методык, вылучэння і матэрыялізацыі новых ідэй. Таму што асноўныя працэсы ўпраўлення ідуць на факультэтах.

Напрыклад, цяпер тэрмінова патрэбна даганяць час з увядзеннем новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, мяняць іх профіль, па Закону аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь пераходзіць на шматступенчатую сістэму навучання. Дзеля гэтага існуюць спецыяльныя кафедры, аддзелы, саветы (Савет грамадскіх навук, навукова-метадычны, па рабоце з замежнымі студэнтамі, па камандзіроўках за мяжу і г. д.), але, скажам, шчыра, іх дзейнасць зведзена да непатрэбных нарад. Ніхто і ніколі не чуў і не бачыў нейкіх іх парад, не тое што метадычных распрацовак.

Жыццё само падказала, што падобныя структуры нікому не патрэбны, бо яны не здольны прагназіраваць агульныя пытанні для ўсіх факультэтаў і спецыялізацый, а існуюць як гурткі аматараў для абмену думкамі.

Справа ў тым, што наша рэспубліка патрабуе таксама новых спецыялістаў міжнароднага ўзроўню. І ўжо сёння, а не праз пяць гадоў. Таму адразу неабходнаісці па шляху ўвядзення спецыялізацый: міжнародныя адносіны, міжнароднае права, міжнародная журналістыка, дыпламатычныя адносіны і г. д. Для гэтага неабходна метадычнае абгрунтаванне. Тым больш, што вопыту арганізацыі такіх спецыяльнасцяў, а таксама адкрыцця асобных аддзяленняў пры факультэтах у нас няма. І зусім лагічна, што са спецыялізацый вырастуць, магчыма, новыя факультэты. Затое ў самы сціплы тэрмін мы атрымаем спецыялістаў спецыфічнага накірунку.

Часта бывае, што самыя важныя праблемы ва універсітэце вырашаюцца вельмі марудна. Узяць, напрыклад, эпапею з Інстытутам павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук. Ужо даўно карэнным чынам змяніўся падыход да грамадскіх дысцыплін, многія з іх проста перасталі існаваць, як і кафедры старога профілю, а інстытут усё перападрыхтоўвае... але невядома каго.

Калі паўстала пытанне аб яго ліквідацыі, як непатрэбнай структуры, кіраўніцтва тэрмінова змяніла профіль, прыдумала новы статут і мае намер вучыць нават настаўнікаў школы і выкладчыкаў сярэдне-тэхнічных устаноў. Але ж у Мінску працуюць рэспубліканскі, абласны і гарадскі інстытуты ўдасканалення настаўнікаў і інстытут перападрыхтоўкі для сярэднетэхнічных устаноў.

Акрамя таго, інстытут размешчаны на універсітэцкіх плошчах, якія цяпер амаль пустуюць. І калі факультэт журналістыкі ставіць пытанне аб агульным яе карыстанні, то атрымоўвае толькі адмову. Хаця ёсць добрая магчымасць размясціць студэнтаў журфака ў адным будынку без асаблівых выдаткаў.

***НАША ДАВЕДКА.** Замежнае аддзяленне факультэта журналістыкі размешчана ў ІПК, там жа чатыры кафедры, друкарня, дысплейны клас, чытальная зала, клас машынапісу, радыёлабараторыя і рэдакцыйна-выдавецкі комплекс.*

Савецкае аддзяленне размешчана на вул. Свярдлова ў дзесяці непрыстасаваных аўдыторыях корпуса эканамічнага універсітэта.

Цяпер справай займаюцца рэктарат, Міністэрства, Савет Міністраў. Бо з вырашэннем гэтага пытання звязана паляпшэнне цяжкіх умоў навучання студэнтаў усіх факультэтаў і, у першую чаргу, тэрміновы рамонт старога фізічнага корпуса, які знаходзіцца ў аварыйным становішчы. Але лабараторыі, абсталяванне і людзей няма куды пераводзіць, і ўсё стаіць на месцы. А пад гэты шумок Інстытут павышэння кваліфікацыі намерыўся... зусім уцячы з універсітэта разам з усёй маёмасцю.

Калектыў інстытута можна зразумець. Хто хоча набываць сабе новыя клопаты, мяняць звыклы лад жыцця? Рэктарат і Вучоны савет сваімі прапановамі і рашэннямі ўлічваюць гэтыя моманты, але ў адказ атрымоўваюць толькі неабгрунтаваныя ўльтыматыўныя захады. Як быццам, у адной універсітэцкай структуры розныя мэты.

Думаецца, такая сітуацыя склалася таму, што ў нашым асяроддзі часта праяўляецца псіхалогія неабгрунтаванага эгаізму. Як толькі перапляталіцца дзелавыя кантакты дэканатаў, кафедр, асобных супрацоўнікаў і студэнтаў з абслугоўваючымі звеннямі нашага калектыву, абавязкова ўзнікаюць незразумелыя супярэчнасці і канфлікты. Хай не крыўдуюць супрацоўнікі, але гэта датычыцца аддзела кадраў, аддзелаў аспірантуры і стажыроўкі выкладчыкаў і дзесяткаў іншых. Колькі іх у нас — паглядзіце ў тэлефонным даведніку. І ўсе займаюць кабінеты ў галоўным корпусе. Навошта нам цяпер, напрыклад, першы аддзел павышанай сакрэтнасці?

Якое дачыненне мае калектыў ІПК да студэнтаў? Ніякага. Так і ў іншых службаў універсітэта. Часта праяўляецца такая схема адносін: нібыта выкладчыкі і студэнты павінны абслугоўваць тых, хто якраз за гэта і атрымоўвае зарплату. Нездарма бытуе парадокс: было б лепш, каб ва універсітэце не было студэнтаў, у тым сэнсе, што тады б настала спакойнае і бесклапотнае жыццё. Але самае цікавае тое, што мы ўсе ўспрымаем становішча і цярпліва зносім бюракратычную цяганіну. Гэта не што іншае, як наўмыснае знішчэнне інтэлекту універсітэта і збіванне яго на ўзровень канторы «Рогі і капыты».

Думаецца, што настаў час менавіта новага абнаўлення ў нашым доме. Рэктарат абгрунтавана звязвае гэта з новымі задачамі ў народнай адукацыі і адказнасцю універсітэта за развіццё нацыянальнай беларускай культуры. І тут, зразумела, без рашучых рэвалюцыйных змен, на якія ідзе рэктарат, не абысціся. Увесь калектыў выкладчыкаў і студэнтаў павінен падтрымаць гэту навізну абнаўлення, каб атэрсці старое і непатрэбнае і даць беларускаму народу маладыя таленты сацыяльна-эканамічнага адраджэння.

ЯКАЯ БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ НАМ ПАТРЭБНА?

# СПЫТАТЬ — НАПАЛАВІНУ ВЕДАЦЬ

***Год назад пры Белдзяржуніверсітэце створана Міжнародная школа беларусістыкі (МШБ) — беларускай мовы, літаратуры і культуры. Са шматлікай пошты, якая прыходзіць у МШБ, я б хацеў прадставіць адну перапіску з незнаёмым мне рэспандэнтам. Думаю, тое, што запыт прыйшоў менавіта ў МШБ — нароўні з афіцыйнымі асобамі — сведчанне таго, што пра школу ведаюць.***

Гэта быў факс з Францыі, з Парыжа, у якім гаварылася:

«Паважаны пан Навумовіч!

Прапаноўваем Вам два нешматслоўных, але значных прыклада таго, што можна прачытаць у французскай прэсе аб Беларусі, пра якую, трэба сказаць, гавораць вельмі мала.

Я ўжо адправіла факс з гэтымі тэкстамі дэпутату Уладзіміру Новіку, папрасіўшы яго адказаць мне афіцыйна.

Ці не маглі б і Вы таксама адказаць мне і прывесці аргументы, у процівагу дадзеным ніжэй сцверджанням.

Дзякую Вам. З прывітаннем Ганна Навумовіч».

Далей ішлі вытрымкі з французскіх газет.

Вытрымка першая з газеты «Фігаро» ад 28 жніўня 1991 года, аўтар яе Элен Карэр д'Анкос, член Французскай Акадэміі, «Беларусь: вынаходніца Савецкай улады». «Беларусь з 20 (?) млн. насельніцтва была таксама захоплена вялікай хваляй незалежніцкіх памкненняў. Аднак у адрозненне ад Украіны, Беларусь не мае выразных нацыянальных асаблівасцяў. Беларуская нацыя не мае гісторыі. Беларуская мова была сфабрыкавана ў 20-я гады савецкімі ўладамі на падставе мясцовых гаворак. І, у выніку іроніі гістарычнага лёсу, калі савецкая ўлада прыдумала гэтую штучную Беларусь, каб аслабіць сапраўдныя нацыі, зраўняўшы іх у становішчы з нацыямі штучнымі, яна, урэшце, здолела пераканаць беларусаў, што яны існуюць як нацыя. У 1991 г. Беларусь хоча быць незалежнай і нават выстаўляе да сваіх суседзяў тэрытарыяльныя прэтэнзіі, вакол якіх узнікаюць гарачыя спрэчкі і нават можа загаварыць зброя...»

Вытрымка другая з газеты «Монд» ад 27 жніўня 1991 г. (перадавы артыкул):

«Прызнаючы, што для Францыі настаў час падправіць свой гадзіннік, Сп. Ралан Дзюма мусіў у нядзелю вечарам прызнаць перспектыву хуткае незалежнасці балтыйскіх краін. Аднак ён дадаў, што патрабаванні іншых савецкіх рэспублік, якія абвясцілі ці пацвердзілі іхнюю волю да незалежнасці пасля няўдалага путчу, выглядаюць праблематычнымі. Але ж як, напрыклад, можна заўтра адмовіць у незалежнасці Украіне, калі гэтая рэспубліка з волі Сталіна і праз недагляд Захаду ўжо мае месца сярод Аб'яднаных нацый? Тое ж самае, дарэчы, і з Беларуссю, нацыянальныя асаблівасці якой ёсць больш чым сумніцельныя».

Не прэтэндуючы на паўнату фактаў і глыбокую тэарэтычную аснашчанасць прыводзімых тут аргументаў, падаю адказ на ліст незнаёмай мне (падкрэсліваю гэта) рэспандэнткі. Ліст той і ўзрадаваў і засмуціў адначасова. Узрадаваў, бо кола нашых сяброў шырыцца, а засмуціў ад таго, што нам яшчэ трэба шмат працаваць, каб свет больш уведаў пра нас, беларусаў і Беларусь.

Мажліва, прыезд на Беларусь Міністра замежных спраў Францыі пана Ралана Дзюма і тыя дыпламатычныя захады ў наладжванні ўзаемаадносін паміж Францыяй і Беларуссю дадуць штуршок для глыбокага ведання пра Беларусь, беларусаў, пра тыя нацыянальныя асаблівасці, якія вылучалі і вылучаюць беларусаў у свеце, пра нацыянальны духоўны космас беларусаў, яго карэнні і разгалінаваную крону. Пакідаючы ўбаку фактычныя недакладнасці, якія маглі трапіць у артыкул замежных аўтараў па недагляду ці няведанню (хоць і гэта наводзіць на роздум!), хацелася б данесці сам дух сённяшняга нацыянальнага абуджэння на Беларусі, яго пафас, пераканаць незнаёмых адрасатаў у адваротным, ці хоць колькі б расказаць пра наша ўчарашняе, пра карані. Добра ўсведамляючы, што ў нацыянальнай гісторыі і самабытнасці народа — невычэрпныя пласты, хацелася б запрасіць навукоўцаў-спецыялістаў выказацца на гэты конт, дапоўніць і развіць гаворку пра нацыянальныя асаблівасці беларусаў, як нацыі, народа, які называецца беларускім, пра адметнасць і непаўторнасць кожнага чалавека, які з гонарам можа сказаць, што «ён — беларус».

Разам з тым, хацелася б, каб прыведзеныя выказванні з замежнай прэсы аб Беларусі і беларусах навялі кожнага з нас на глыбокі роздум, якая ўсё ж беларусізацыя нам патрэбная, ці ўсё мы робім, каб напоўніць суверэнітэт Рэспублікі Беларусь рэальным зместам, каб не быць «выкапнёвай», «рэліктавай» альбо вымíраючай нацыяй. Раздаюцца галасы супраць «оголтелой белорусизации», прапановы стварыць свой нацыянальны універсітэт. Але, відавочна, што ў межах нашага дзяржаўнага універсітэта яшчэ трэба шмат зрабіць, каб беларускі універсітэт стаў сапраўды беларускім.

Мажліва, што тыя радкі цытат з-за мяжы навядуць некаторых «хісткіх» поглядамі людзей, што не можа быць замнога беларускага ў беларуса. А што датычыць талерантнасці, лагоднасці і мяккасці, беларусаў, дык у гэтым не прыходзіцца сумнявацца, тут беларусы нікога не паціснулі, яшчэ ні разу не зневажалі, нікога яны і не ўзбунтуюць сваёй «оголтелостью». Можа якраз мала нам гэтай самай «оголтелости», ці апантанасці. Наадварот, ці не занадта доўга мы рахмана паводзілі сябе, каб крый Бог, не засердавалі людзі поруч, гатовы сваё папусціць, сябе абнізіць, абы іншым жылося лепей. Дальбог жа, атрымоўваецца, як у той народнай прыказцы: «Дазвольце мне ў сваёй хаце пад лаўкай пераначаваць». Можа лепей было б пачувацца дабразычлівымі і клапатлівымі гаспадарамі ў сваёй хаце, каб і людзі-суседзі, народы-браты падзівіліся і самі беларусы пацешыліся добрым беларускім духам пад кожнай страхой, у кожнай святліцы, у душы асобнага чалавека. Ды каб разам з тымі людзьмі, якія жывуць поруч, хоць і не з'яўляюцца беларусамі па нацыянальнасці, парадаваліся — усцешыліся, што жывём мы душа ў душу, добрым і згодным ладам, сярод мірных, працавітых і душэўных людзей на багатай духоўнымі традыцыямі, нацыянальнымі асаблівасцямі, сваім каларытам, на непаўторнай і мілай беларускай зямлі.

Запрашаем навукоўцаў-педагогаў, студэнтаў да працягу размовы аб нацыянальным духоўным космасе беларусаў.

**У. НАВУМОВІЧ,**
дырэктар Міжнароднай школы беларускай мовы, літаратуры і культуры, дацэнт.

## САКРЭТ ФІРМЫ

### *ВРАНГЕЛЬ ПЕРШЫ У ЧАРЗЕ*

*Сімферопальскі дзяржаўны універсітэт імя Фрунзе, магчыма, хутка заменіць сваё імя. Напрыклад, на Врангеля. Дацэнт гэтай ВНУ В. Панамарэнка публічна заявіў аб такім жаданні. Ён лічыць, што барона неабгрунтавана назвалі «чорным», і Фрунзе, які заліў крывёй паўвостраў, не больш дастойны, чым Врангель.*

*Але ж у Сімферопальскім універсітэце вучыліся і працавалі ў свой час Вернадскі, Курчатаў... Наўрад ці яны пажадалі б стаяць у чарзе пасля барона Врангеля.*

### *У НАТЫНГЕМ ПАЕДУЦЬ...*

*25 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта павінны былі накіравацца летам гэтага года ў Натынгем — па абмену з такой жа колькасцю студэнтаў мясцовага універсітэта. Але фінансавыя праблемы абодвух бакоў прымусілі арганізатараў паездкі зменшыць колькасць шчаслівчыкаў да 15. Прадстаўнікі спецыяльнасці «Міжнародныя эканамічныя адносіны» маюць большы за іншых шанц на паездку — ім патрэбна моўная практыка. Месцы ў групе ёсць таксама для трох пераможцаў універсітэцкай алімпіяды на лепшае веданне англійскай мовы. Яшчэ пяць месцаў чакаюць па аднаму прадстаўніку наступных факультэтаў: фінансавага, учотнага, гандлёва-эканамічнага, гандлёва-таваразнаўчага і эканомікі АПК.*

*Пражыванне нашых студэнтаў у Натынгеме будуць фінансаваць іх англійскія калегі.*

### *НЕ СІЛАЙ, А РОЗУМАМ*

*Яшчэ зусім нядаўна самымі заможнымі студэнтамі лічыліся хлопцы з Інстытута фізкультуры, якія маглі зарабляць грошы ў якасці целаахоўнікаў рознага роду прадпрымальнікаў. Але цяпер наўздагон ім накіраваліся студэнты інстытутаў замежных моў, якія багацеюць за кошт інтэлектуальных выдаткаў. Сёння ім хапае заказаў на пераклады. Рызыкі гэта не патрабуе, а ганарары — не толькі ў рублях, часам і ў валюце.*

### *ПА ЗАКОНУ ПОМСТЫ?*

*За апошні час у Віцебску зарэгістраваны дзве бойкі моладзі з амонаўцамі. У адной з іх прымалі ўдзел студэнты. Ёсць меркаванне, што так яны помсцяць за гібель студэнта Віцебскага медінстытута ад амонаўскай дубінкі. Вядзецца крымінальнае расследванне. Кіраўнікі гарадскога Упраўлення ўнутраных спраў нават завіталі ў медыцынскі інстытут для гутаркі са студэнтамі. Аднак тыя, не атрымаўшы канкрэтных адказаў на пытанне аб ходзе расследвання забойства, дэманстратыўна пакінулі залу, дзе адбывалася сустрэча. Следства па справе гібелі студэнта працягваецца.*

*Па матэрыялах газет «Поиск» і «Эканаміст».*

Тым, хто ў час доўгай зімы старанна хаваў твары ў высокія каўнеры. Тым, хто зашпілены на ўсе гузікі і зацяты ў вузкай прасторы ўласнай футры.

Мы паведамляем:

# ЗНІМАЙЦЕ КАЖУХІ І АПРАНАЙЦЕ ВЕСНАВЫЯ ЎБОРЫ



Мы ведаем, што гэта вельмі цяжка — пазбавіцца звычкі ўзірацца на сустрэчных як на ворагаў. Што амаль немагчыма стрымаць інерцыйны бег з перашкодамі, спыніцца на хвіліну і заўважыць, што сцюдзёныя маразы, якіх мы з бояззю чакалі, так і не надышлі, а сонейка, не падазраючы пра нашы жахі, а можа насуперак ім, усміхаецца ўсё цяплей.

Дык што вы ўчапіліся абедзвюма рукамі ў безнадзейнасць і песімізм? Няма вакол вясёлых твараў? Пасміхайцеся самі і часцей зазірайце ў люстэркі. Не знайшлі таннага мяса? Карыстайцеся бясплатнай пакуль сонечнай энергіяй.

А тым, хто лічыць усе нашы парады бязглуздымі і непрадбачлівымі, мы ўсё роўна ўсміхнемся: «Дзіўныя вы людзі, вясна ж у горадзе!»





ПРЭС-АПЫТАННЕ

# ПАЛЯВАННЕ ЗА ВЕРАЙ

**ВЕРУ — НЕ ВЕРУ.**

**А ЎВОГУЛЕ, У ВА ШТО НАМ ЗАСТАЛОСЯ ВЕРЫЦЬ? НА ГЭТАЕ ПЫТАННЕ ШУКАЮЦЬ АДКАЗ УДЗЕЛЬНІКІ НАСТУПНАГА ПРЭС-АПЫТАННЯ.**

Валерый Мікалаевіч **ГАДУНОЎ**, дэкан юрыдычнага факультэта:

— Складанае пытанне... Веру ў тое, што становішча стабілізуецца, і ў будучым мы абавязкова прыйдзем да дэмакратычнага прававога грамадства. Гэта цяжка, але іншага шляху ў нас няма. А ў Бога я не веру, застаўся матэрыялістам.

Ірына **АБАЛЕНСКАЯ**, другі курс геаграфічнага факультэта:

— У светлую будучыню!

Андрэй **АХМЕТШЫН**, чацвёрты курс факультэта журналістыкі:

— У Бога...

Тамара Іванаўна **СМОЛЬСКАЯ**, лабарант кафедры этыкі і эстэтыкі:

— Веру ў чалавека як у асобу, як у індывідуальнасць і спадзяюся толькі на сябе.

Адам Данілавіч **КІШКЕВІЧ**, старшыня студэнцкага прафкома:

— Усё ў грамадстве наладзіцца. Інакш навошта жыць? Трэба кожнаму прыкладаць як мага больш намаганняў, працуючы на сваім месцы.

Ігар **БАГІНО**, другі курс геаграфічнага факультэта:

— А я нічаму і нікому не веру.

Андрэй **ЛІПЕНЬ**, другі курс механіка-матэматычнага факультэта:

— Самае асноўнае: я веру ў розум, а яшчэ — у дзелавых людзей, у чалавечую актыўнасць, у пад'ём душы, чалавечага духу (у такі момант можна зрабіць усё) і ў сябра веру.

**ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, КАЛІ З СЯМІ ЧАЛАВЕК ТОЛЬКІ АДЗІН — ПЕСІМІСТ. ЦІ МОЖНА СЦВЯРДЖАЦЬ, ШТО ЎСЕ МЫ ДАЎНО СТРАЦІЛІ ВЕРУ?**

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

## НОРАВЫ

## «ІХНЯГА»

## ЖЫЦЦЯ

*З 1 ліпеня мінулага года ў ЗША уведзена абмежаванне на выступленне замежных гастралёраў: цяпер іх павінна быць не больш чым 25 тысяч у год. Так што калі вы 25001, то заставайцеся лепш дома. Гэта мера накіравана галоўным чынам супраць англійскіх каманд, якія трывала акупіравалі амерыканскія падмосткі.*

* * *

*Пасля трохгадовага лячэння ад алкагалізму вярнуўся да творчасці Ван Хален. Яго апошняя кружэлка «За Плоцевыя Беззаконнасці» была сустрэта на ўра. Адным словам, лячэнне пайшло на карысць.*

* * *

*На адной з манчэстэрскіх дыскатэк «Хасігнда» былі паранены шэсць чалавек. Хіп-хоп небяспечны!*

* * *

*У ліпені мінулага года Стынг упершыню за час сваёй кар'еры быў асвістаны і закіданы розным брудам. Адбылося гэта на канцэрце ў Мілане, дзе публіка была злая на яго песні з альбома «Клеткі Душы». «Раней Стынг быў лепшы, зараз ён дэградзіраваў і займаецца халтурай»,— лічаць эмацыянальныя італьянцы.*

* * *

*Чарговы псіхоз англійскіх падлеткаў: красціз-гурт «Картэр-Анстапабл Сек Мэшын». Нагадаем, што красціз — новы маладзёжны накірунак. Яго прыхільнікі носяць коры на 12 дзірак, доўгія таўстыя шкарпэткі, майкі і шорты на некалькі памераў большыя, чым трэба, кепкі бейзбалухі абавязкова задам-наперад. Слухаць красціз-гурты «І,Эм.Эф.», «Нэтс Этомік Дастбін», «Вандэрстаф». І вось новае захапленне — «Картэр...»*

* * *

*7 ліпеня 1991 года на стадыёне Уэмблі адбыўся душараздзіраючы канцэрт пастарэлых рок-брантазаўраў — гурта «Бі Джыз». Публіка рыдала, свабодных месцаў не было.*

* * *

*Фірма «Кэпітал» унесла 800 тысяч долараў закладу, каб вызваліць з-пад арышта рэппера па мянушцы Рык Слік. Ні пра якую праяву міласэрнасці гаварыць не даводзіцца, паколькі фірме пагражалі б вялікія страты ў выніку спынення работы над другім альбомам выканаўцы. Першы альбом сустрэў сапраўдны камерцыйны фурор у ЗША. Слік быў арыштаваны з-за забойства кузена, ён матываваў свой учынак помстай за крадзеж.*

* * *

*Невядомыя асобы выкралі стужкі з апошнімі пробнымі запісамі гурта «V2». Фірма «Айлэнд» пагражае страшнай карай тым, хто асмеліцца выпусціць запісы.*

## РОК-МЕМУАРЫ

Што мы ведаем пра рок-музыку 60—70-х і пачатку 80-х? Амаль нічога. Літаратуры пра гісторыю рока вельмі і вельмі мала. Калі недзе і выйдзе невялічкім накладам якая кніга, то адразу ж робіцца бестселерам. Відаць, падобны лёс наканаваны і кнізе Ул. Рэкшана «Кайф поўны», прысвечанай піцерскай рок-музыцы 60—70-х гадоў.

«Імя Рэкшана,— як піша ў прадмове В. Лемесаў,— адным скажа ўсё, другім — нічога. Для «ўмоўнага горада валасацікаў гэта імя даўно стала часткай падання, называемага «Санкт-Пецярбург», падання, якое перадаецца ад аднаго да другога пры дапамозе акустычнай гітары».

# КАЙФ

Усім меламанам раю звярнуць увагу на гэтую кнігу.

Валасацікам услед плявалі бабулі, хмурыліся міліцыянеры. Часам за доўгія валасы маглі пабіць. Некалькі разоў, вяртаючыся вечарам з рэпетыцыі, мне даводзілася абараняць гонар, і абараняць кулакамі. Бацькі перасталі са мной размаўляць. У парыве нейкага юнацкага вар'яцтва па начах я слухаў новую музыку, запісы ці кружэлкі, днём сачыняў сам, вечарамі рэпеціраваў у «Мусе» [1], тэрарызуючы сяброў, даставаў дынамікі, збіраў акустычныя калонкі, паяў правады, цягаў, сотні разоў цягаў апаратуру па паверхах «Мухі», з «Мухі» і ў «Муху», калі нас гналі адтуль і вярталі назад. Мне яшчэ не было і дваццаці.

Гарадскія рок-гурты тых часоў, калі і пелі ўласныя песні, то толькі як какетлівы дадатак да «фірмы». Гэта называлася «зняць адзін да аднаго». «Лясныя браты», «Арганаўты» і «Фламінга» рабілі копіі лепш за ўсіх. Мы ж рэпеціравалі свой — цяп-ляп, іржавыя цвікі і гарбылі, але — сваё. Тварылі, елкі-палкі, насуперак Усходу і Захаду. Як уедлівы юнак, па начах я слухаў не толькі рок-н-ролы, але і, накупіўшы за бясцэнак, запісы Вівальдзі, Баха, лютневай музыкі, Малера і іншых, апладняючы ў памяці рок-н-ролы гармоніямі вялікіх. Зрэшты, гэта толькі пашырала светапогляд, не дадаючы нічога да музыкі «скайфлз» — музыкі падваротняў, якую я сачыняў. Праўда, тады мы рэпеціравалі ў акультураным падвале ЖЭКа. Атрымліваецца, што гэта была падвальная музыка, сапраўдны «андэрграунд».

У выніку «конкурсаў» і іншай тэрарыстычнай дзейнасці Боб і Лёха [2] непадзельна аддаліся спорту, а іх месца занялі бліскучыя «слухачы», рыжыя Лемегавы з Акадэміі мастацтваў.

У падвал на рэпетыцыю Сярогу прынеслі, а Валодзя прыйшоў сам. Ён сеў за барабаны, дрэнныя барабаны ажылі, заспявалі на розныя галасы, Сяргей перакінуў рэмень праз плячо, басовым глісанда паімкнуўся ў першую чвэрць. У мяне ажно слюнкі пацяклі. Такая кайфовая атрымалася рытм-секцыя!

Сярога і Валодзя вучыліся на архітэктурным з Альбертам Асадуліным, разам музыцыравалі да пары, але Альберт, моцны тэнар, ужо прыглядаўся да прафесійнай сцэны. Браты мелі салідную практыку, яны былі выразнымі рослымі юнакамі з рыжымі вусамі. Сярэдні рост нашага нігілістычнага зборышча адпавядаў 185 сантыметрам, а гэта таксама мае значэнне. Я дагэтуль прытрымліваюся думкі, што для поспеху, у першую чаргу, трэба падабацца дзяўчаткам у зале, а ім у зале і па-за залай чамусьці больш падабаюцца высокія хлопцы.

У той жа час вяліся перагаворы з Міхаілам Баярскім. Ён вучыўся ў тэатральным на Махавой, недалёка ад «Мухі». Там жа, на Махавой, ён рэпеціраваў з «Качэўнікамі» ў малюсенькай зале, нейкі час мы рэпеціравалі паралельна.

Памятаю лета, спякота, анёлы і карыятыды, шпілі адлюстроўваюцца ў вадзе. Напракат бяром лодку і вяслуем па каналу Грыбаедава ў ласкавай тапалінай чэрвеньскай завеі. Баярскі гаворыць, быццам мае намер сабраць гурт, па галасах аналагічны «Бітлз». У мяне бас-барытон, у яго — высокі барытон. Мае нігілісты не аналагічныя «Бітлз», а мэты Баярскага не задавальняюць нас. І наш «Санкт-Пецярбург».

Назвам, прычоскам і іншым аксэсуарам нігілісты тады, ды й зараз, надавалі значную частку сваёй нігілістычнай дзейнасці.

— «Санкт-Пецярбург»,— сарвалася з языка пад час святынай сталокі.

Рыжыя браты і Лятаючы Сустаў [3] замёрлі, доўга маўчалі, цокалі языкамі, я ж, спацеўшы ад задавальнення, чакаў.

— «Санкт-Пецярбург»? — перапытаў Лятаючы Сустаў.

— Крута! — сказалі рыжыя браты.

Так, мы нарадзіліся ў гэтым горадзе, выраслі ў старым цэнтры, і горад жыў у нас, і будзе жыць да апошняга дня; мы не добра ўмелі, але сачынялі самі, на роднай мове, а іншыя ж — многія! — даказвалі:

— Рок не для рускай мовы! Кароткая фраза англічаніна — у кайф, а руская — доўгая, несуразная і не ў кайф. Не ўрубаецеся, ці што?

Гэта абражала. І марылася, няхай не на ўзроўні дакладнай фармулёўкі, праявіць сябе, даказаць, што набыты з узростам абавязак служыць у войску і права ажаніцца павінны быць дапоўнены неабходнасцю абавязка і права на свой кліч; быццам народжаныя, мы марылі закрычаць па-руску:

— **МЫ ЁСЦЬ!**

Я напісаў кампазіцыю «Сэрца камня» «прысвяціў яе Брайану Джонсу: «І ў камня бывае сэрца, і з камня можна выціснуць слязіну. Лепш камень, што ўпадае ў мары, чым чалавек з каменным сэрцам...» Мі-мінор, рэ-мажор, до-мажор, сі-мажор па кругу плюс другая частка — варыяцыі круга і рытм-секцыя. Я напісаў баявую кампазіцыю «Восень» і яшчэ больш баявітую «Санкт-Пецярбург».

У мяне ў «дапіцерскія» часіны меўся некаторы вопыт — правал на вечары біялагічнага факультэта ў ДК «Маяк»: наш выпадковы квартэт першакурснікаў іграў дрэнна, і нас асвісталі; аднойчы я дапамагаў іграць на танцах у пасёлку Перп ансамблю, сабранаму з паляўнічых рабочых хлопцаў — памятаю невялічкую пыльную залу, памятаю, як перагарэлі ўзмацняльнікі, памятаю, біліся ў зале з-за дзяўчат і пабілі кагосьці з аркестрантаў...

1. «Муха» — Вышэйшае прамысловае вучылішча імя Мухінай.

2. Боб і Лёха — Боб Галкін (барабаншчык) і Лёха Матусаў (бас-гітара) — адны з першых членаў гурта.

3. Лятаючы Сустаў — так сярод сваіх звалі Міхаіла Марскага (іграў на раяле).

ЗАЎВАГА: падзеі, пра якія тут ідзе гаворка, адносяцца да 1968 года.

(Яшчэ нядаўна кніга прадавалася ў магазіне «БЕАТ» (вул. Брылеўская, 14). Ці ёсць зараз — не ведаю. Жадаю поспехаў у пошуках кнігі і прыемнага чытання).



## «САДРУЖНАСЦЬ» УМАЦУЕ САДРУЖНАСЦЬ!

Мы заўсёды любілі нашу штогадовую «Песню», усесаюзную «выставу» дасягненняў нашых кампазітараў і спевакоў. Сёння гэта ўжо фестываль песні «Садружнасць». Артысты з'ехаліся выступаць у наш Мінск. Але пакуль не вельмі дружна, і афішы абяцалі болей, чым гледачы ўбачылі на сцэне Палаца спорту. Тыя «зоркі», што ўсё ж прыехалі ў новую сталіцу, падарылі гледачам сапраўднае свята.

НА ЗДЫМКАХ: эстрадныя славутасці на сцэне Палаца спорту.

Фота С. ГРЫЦА.

## «САРОЧНЫСКІЯ»

## ВЕСТКІ

### *МАЛАЯ ЦАРКВА*

*Пад такім мяноклічам у сярэдзіне лістапада ў Наваполацку прайшоў дабрачынны канцэрт з удзелам тутэйшых рокгуртоў «Мясцовы час», «Грунвальд», «Учора», «Адзел кадраў», віцебскай каманды «Магістр» і вядомага барда Сяржука Сокалава-Воюша. Сабраныя грошы музыканты пералічылі на рахунак для фінансавання будаўніцтва ў Наваполацку Свята-Міхайлаўскай царквы. Цікава, што на просьбу арганізатараў асвянціць канцэрт прадстаўнікі духавенства далі адмову, матывуючы яе тым, што «царква і рок усё ж такі супярэчаць адзін аднаму». Хочацца верыць, што праведзены канцэрт будзе спрыяць збліжэнню супярэчнасцяў, а для тых, хто захоча падтрымаць ініцыятыву музыкаў, паведамляем нумар рахунка, на які можна пералічыць ахвяраванні на пабудову храма: 000701401 у Наваполацкім аддзяленні Прамбудбанка.*

### *«ДОМА ДОБРА, АЛЕ Ў ГАНОВЕРЫ ЛЕПШ»*

*Да такой высновы прыйшлі наваполацкія музыканты Уладзімір Багдановіч і Валерый Аксёнаў, аб'яднаўшыся ў каманду пад назвай «Аркестр Вовы Эсмарха». Паспрабаваўшы шчасця спачатку ў родным горадзе, затым у сталіцы былога СССР, музыкі-мульціінструменталісты хутчэй перайшлі на ангельскую мову, вырашыўшы, што штурмаваць MTV куды перспектыўней.*

## «МУЗЫКА» ЁСЦЬ. «МЕЛОДЫЯ» ЁСЦЬ. КРУЖЭЛАК НЯМА

Апусцелі паліцы і «Мелодыі», і «Музыкі», і ўсіх астатніх. Відаць, старыя дыскі ўжо распрададзены, а новыя... Ці былі яны ўвогуле? Магчыма. Толькі, як і любы іншы тавар за драўляныя рублі без купонаў, доўга вочы пакупнікам не мазоляць.

Сітуацыя складваецца парадаксальная. Музыка, маладзёжная і не толькі, добрая і так сабе, развіваецца такімі тэмпамі, што ад колькасці новых поп-, рок-, шоу-... гуртоў часам дух захапляе. Каб яшчэ гэта колькасць калі-нікалі пераходзіла ў якасць. Тут ужо студыі грамзапісу «Мелодыя» ўсе карты ў рукі: выбірай лепшых выканаўцаў (балазе, недахопу ў хіт-парадах не існуе) і штампуй кружэлкі на радасць меламанам. Але гэтага чамусьці не атрымліваецца.

Не атрымліваецца ў «Мелодыі», і хай сабе. Колькі прыхільнікаў сучаснай музыкі з палёгкай уздыхнулі, даведаўшыся, што пачалі з'яўляцца незалежныя студыі грамзапісу. Прыватныя ж фірмы, спадзяваліся яны, не будуць тыражыраваць Кузьміна, Барыкіна, Дабрыніна. У нейкай ступені іх спадзяванні спраўдзіліся. Незалежныя фірмы («Сінтэз Рэкордз», МП «Рускі дыск», «Ладъ» і іншыя) даволі аператыўна пачалі выпускаць кружэлкі папулярных сярод моладзі выканаўцаў, у асноўным рок-гуртоў, праўда, не забываючыся пра астатніх. Але ж фірмы пакуль яшчэ не надта вялікія, а СНД крыху менш за шостую частку свету. Паспрабуй усіх задаволіць.

Відаць, таму частыя наведванні «Музыкі» і «Мелодыі» хутчэй старая звычка, чым жаданне там нешта набыць (калі раптам не нарвешся на што-небудзь цікавае).

Праўда, апошнім часам з'явілася ў Мінску адно месца, куды ёсць сэнс заглядаць час ад часу, а лепш — часцей. Па вуліцы Брылеўскай, 14 адкрылася маленькая прыватная музыкальная крама «ВЕАТ», дзе тавару больш, чым у вялікім дзяржгандлю. Напрыклад, выбар кружэлак не меншы, чым у той жа «Мелодыі». Дарэчы, тавар там не толькі айчынны. Цэны? Цэны рыначныя і залежаць у асноўным ад попыту, складаюць ад чырвонца да палціны (бывае і больш). Але ж меламаны са мной пагадзяцца: быў бы тавар, а за цаною мы не пастаім. Тым больш, што і ў «Музыцы» яны не намнога меншыя.

Я спадзяюся, што нядоўга засталося чакаць новых «ВЕАТаў». Напэўна, прыватны гандляр не будзе абслугоўваць пустыя паліцы. І калі суседзі па былому Саюзу не ў стане запаланіць нас добрай музыкай, звернемся да замежжа. Яно дапаможа!

А пакуль пайду на Брылеўскую. На днях абяцалі Боба падкінуць. Раптам пашанцуе.

А. ЮРЫН,
адказны дырыжор
«Аўдыторыі № 7».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

12 сакавіка

Зак. 2184.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.